грамадска-палітычная газэта

# >РУХ у Еўропу>

№4(04) верасень 2011г.

СТРУКТУРЫ ЕС

## ЕЎРАПЕЙСКАЯ КАМІСІЯ

**Еўрапейская камісія – вышэйшы орган выканаўчай улады Еўрасаюза. Адказвае за выкананне рашэнняў Звяза, кантралюе выкананне яго законаў у краінах-чальцах і, калі патрабуецца, узбуджае ў судзе Еўрапейскага звяза пазоў супраць краін-чальцоў за парушэнне чалецкіх забавязанняў.**



У яе склад уваходзяць 27 камісараў, якія прызначаюцца адзінай дамовай урадаў краін-чальцоў на пяцігадовы тэрмін. У Камісіі павінен быць прынамсі адзін прадстаўнік з кожнай краіны-чальца. Чальцы Камісіі ў сваёй працы рэпрэзентуюць не сваю краіну, а ўвесь Еўрапейскі звяз. Усе прапановы ЕС павінны праходзіць праз Камісію. Прадстаўнікі Камісіі маюць права ўдзельнічаць у абмеркаванні прапановы ва ўсіх правамоцных органах ЕС.

Задача Еўракамісіі – каардынацыя працы органаў выканаўчай улады ўсіх краін ЕС, выпрацоўка рэкамендацый для дзейнасці Еўрапарламента, вылучэнне заканадаўчых ініцыятыў для прывядзення ў адпаведнасць з агульнаеўрапейскімі стандартамі нацыянальнага заканадаўства краін-чальцоў ЕС, назіранне за выкананнем усімі 27 краінамі адзіных еўрапейскіх стандартаў, а таксама правоў і свабод чалавека, правядзенне сістэматычных кансультацый з усімі нацыянальнымі ўрадамі для выпрацоўкі адзінай эканамічнай, ваеннай, вонкавай, культурнай палітыкі.

Еўракамісія ў першую чаргу кантактуе з міністрамі па справах ЕС у кожным з урадаў 27 краін-чальцоў.

Усе рашэнні Еўракамісіі носяць вылучна рэкамендацыйны характар, усе спрэчныя пытанні ўлагоджваюцца на ўзроўні нацыянальных урадаў. Акрамя таго, Еўрапейская камісія выконвае дыпламатычныя функцыі ЕС за мяжой праз сетку сваіх прадстаўніцтваў.

Кожны з 27 камісараў, як і міністр нацыянальнага ўрада, адказвае за вызначаны кірунак працы. Кожнага кандыдата ў Еўракамісію рэкамендуе ўрад яго краіны, затым ён праходзіць гутарку са старшынёй Еўракамісіі і зацвярджаецца Еўрапарламентам.

Акрамя таго, у структуру Еўракамісіі ўваходзяць генеральныя дырэктараты – гэта аналагі ўрадавым міністэрствам. Генеральныя дырэктараты з'яўляюцца профільнымі і адказваюць за рэалізацыю палітыкі ў розных сферах кампетэнцыі ЕС.

Еўрапейская камісія новага складу пачала працу 22 лістапада 2004 года.

Будынак у цэнтры Брусэля, у якім месціцца еўракамісія спраектаваны адмыслова для Еўракамісіі ў 1960 г. як знак Еўрапейскай супольнасці.

## ЎЛАДЫ ПАВІННЫ РЭАБІЛІТАВАЦЬ АСУДЖАНЫХ

**Дзяржавы ЕС лічаць, што беларускія ўлады павінны не памілаваць асуджаных па справе «19 снежня», а рэабілітаваць, заявіла ў інтэрв'ю агенцтву Інтэрфакс-Захад» пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Розмары Томас.**

Каментуючы заяву Аляксандра Лукашэнкі аб дыялогу з апазіцыяй пры ўдзеле ЕС і Расіі, Р.Томас заўважыла, што афіцыйнага запрашэння пакуль не паступіла. Дзяржавы ЕС, паводле брытанскага дыпламата, хацелі б пачуць у часе гэтага дыялогу «аб фармаванні ў Беларусі шматпартыйнай дэмакратыі». «Калі ЕС прыйдзе да высновы, што за гэтай прапановай стаіць шчыры намер, я ўпэўненая, што ЕС захоча ў гэтым праекце удзельнічаць. Але ЕС зможа разглядаць пытанне аб удзеле ў круглым стале толькі тады, калі пытаньне вызвалення і поўнай рэабілітацыі ўсіх зняволеных будзе вырашанае», — падкрэсліла пасол.

Р. Томас дадала, што «ЕС так і не ачуняў ад глыбокага шоку і засмучэння», якія зазнаў пасля падзеяў 19 снежня ў Беларусі.

Апошнім часам афіцыйныя СМІ выказваюць меркаванне, што прапануючы дыялог з усімі патрыятычна настроенымі сіламі, Лукашэнка зусім не меў на ўвазе апазіцыю.

# ВЫЗВАЛІЦЬ І РЭАБІЛІТАВАЦЬ ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ

**3 верасня ў польскім Сопаце завяршыўся двухдзённы саміт міністраў замежных спраў краін Эўразьвязу і дзяржаў-кандыдатаў на далучэньне да аб'яднанай Эўропы: Турэччыны, Македоніі, Чарнагорыі, Харватыі ды Ісьляндыі. У часе сустрэчы пад кіраўніцтвам Кэтрын Эштан размова вялася і пра сытуацыю ў Беларусі.**

У часе вынікова́й прэсавай канфэрэнцыі пасьля завяршэньня нарады міністраў, вярхоўны прадстаўнік ЭЗ па замежных справах і палітыцы бясьпекі **Кэтрын Эштан** заявіла, што пазыцыя 27 краінаў-чальцоў зьвязу што да Беларусі застаецца нязьменнай:

«Мы, канечне, адзначылі апошнія падзеі ў Беларусі — некаторыя заявы і захады, але паўтаруся, што мы патрабуем вызваленьня і рэабілітацыі ўсіх палітычных зьняволеных. Гэта была і ёсьць нашая пазыцыя. Пазыцыя, якой мы будзем цьвёрда прытрымлівацца». Паўтаруся, мы патрабуем вызваленьня і рэабілітацыі ўсіх палітычных зьняволеных.

У часе спатканьня былі абмеркаваныя таксама пытаньні дапамогі Лібіі, дачыненьні з Сырыяй ды далейшае супрацоўніцтва з краінамі — суседзямі Эўрапейскага зьвязу, у тым ліку падрыхтоўка да саміту Усходняга партнэрства ў Варшаве, што запляніаваны на канец верасьня.

«Мы на добрым шляху, што тычыцца прыняцьця важных рашэньняў пра пачатак перамоваў у справе стварэньня абшараў вольнага гандлю з Грузіяй і Малдовай, а таксама завяршэньня такіх перамоваў з Украінай», — заявіў міністар замежных спраў Польшчы **Радаслаў Сікорскі.**

Між тым 2 верасьня ў Беластоку старшыня Эўрапейскага парлямэнту **Ежы Бузэк** таксама закрануў тэму магчымых перамоваў з афіцыйным Менскам.

«Цяпер Эўразьвяз ні ў якім выпадку ня пойдзе на якія-кольвечы паразуменьні і перамовы (зь Беларусьсю — аўт.) ў крэдыт. Спачатку прэзыдэнт Лукашэнка павінен вызваліць усіх палітвязьняў, акрэсьліць будучыя ўмовы дзейнасьці незалежных арганізацый, незалежных мэдыяў, гарантваць свабоду навукі, перамяшчэньня. Калі гэта ўсё будзе зроблена, то Эўразьвяз, канечне, будзе адкрыты для супрацоўніцтва, супольных праектаў, у тым ліку і для эканамічнай падтрымкі», — сказаў Ежы Бузэк.

# "ПЛАН МАРШАЛА" ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Беларуская апазіцыя з натхненнем вяртаецца з паездкі ў Варшаву, дзе прайшлі сустрэчы з прэм'ер-міністрам Польшчы Дональдам Тускам і часткай МЗС Радаславам Сікорскім.**

Як паведамляецца, Туск непразрыста намякнуў, што ў выпадку прыходу да ўлады ў Менску "дэмакратычна арыентаваных сіл" Захад, і ЕС у прыватнасці, разглядаюць магчымасць прапанаваць беларусам праграму дапамогі для паскоранага развіцця эканомікі - штосьці накшталт "плану Маршалла", які падняў пасля Другой сусветнай вайны Еўропу з руін.

Мяркуючы па словах Туска і заявам беларускіх апазіцыянераў, праграма дапамогі будзе прадугледжваць вылучэнне крэдытаў на развіццё беларускай эканомікі, а таксама супрацоўніцтва ў вобласці інвестыцый і сацыяльнай сферы. Ну а пакуль, як паведаміў міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі, ствараецца агульнаеўрапейскі фонд для падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі, багацейшы, чым усе цяпер існыя. Апроч палітыка-эканамічнай сітуацыі ў краіне і магчымых перспектыў яе дэмакратызацыі польскі бок цікавіла меркаванне беларускай апазіцыі, ці варта запрашаць афіцыйны Менск на саміт "Усходняе партнёрства", які павінен прайсці ў Варшаве ў канцы верасня цяперашняга года.

Пра новы "план Маршалла" адразу пасля сустрэчы радасна паведаміў журналістам старшыня партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада **Станіслаў Шушкевіч**. "Я шалёна задаволены, - заявіў ён. - Вынікі сустрэчы перасягнулі нашы самыя адважныя чаканні".

Беларускія апазіцыянеры па выніках сустрэчы наогул выпраменьвалі аптымізм. Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Беларусі **Анатоль Лябедзька**, адзін з удзельнікаў разнамаснай беларускай дэлегацыі, якая ўяўляе практычна ўвесь палітычны спектр апазіцыйных рэжыму сіл краіны, адзначыў, што Лукашэнка на сённяшні дзень ужо не з'яўляецца безумоўным лідарам.

У сувязі з фінансава-эканамічным крызісам у рэспубліцы імкліва шырацца незадаволенасць і недавер насельніцтва да яго кіравання. А акрамя таго, катэгарычна сапсаваны адносіны з галоўным стратэгічным партнёрам і фундатарам рэжыму - Расіяй. Гэта пазбаўляе Лукашэнку яго галоўнага козыра - сацыяльна-арыентаванага вектару ягонай палітыкі. І цяпер для ЕС самы падыходны момант, каб аказаць ціск на рэжым з мэтай яго дэмакратызацыі.

Не быў абыдзены ўвагай на сустрэчы і нядаўні "пракол" Варшавы, калі генеральная пракуратура Польшчы перадала раздрукоўку банкаўскіх рахункаў **Алеся Беляцкага** - кіраўніка праваабарончага беларускага цэнтра "Вясна". Міністр замежных спраў Польшчы яшчэ раз прынёс беларускім гасцям выбачэнне "за недагляд" і паабяцаў, што Варшава і надалей будзе прадпрымаць усе высілкі, каб Беляцкі неўзабаве выйшаў на волю.

Нагадаем, што беларускаму праваабаронцу пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі. А сёння Польшча аказвае фінансавую дапамогу сям'і Беляцкого, які знаходзіцца у беларускіх засценках з 5 чэрвеня, і будзе прыкладаць усе высілкі для яго найскарага вызвалення.

ПЕРСАНАЛІІ

# ЕЎРАКАМІСАР

**Жазэ Мануэл Бароза нарадзіўся 23 сакавіка 1956 у Лісабоне, партугальскі і агульнаеўрапейскі дзяржаўны і палітычны дзеяч.**

У 1978 г. Барозу скончыў юрыдычны факультэт Лісабонскага ўніверсітэта, затым Жэнеўскі універсітэт, дзе ў 1981 атрымаў ступень магістра палітычных навук. Некаторы час з'яўляўся асістэнтам прафесара ў Лісабонскім універсітэце. Пазней атрымаў ступень доктара філасофіі ў найбуйным амерыканскім каталіцкім Джорджтаунскім універсітэце. Пасля вяртання на радзіму працаваў адміністрацыйным супрацоўнікам Лузітанскага ўніверсітэта ў Лісабоне. Таксама Барозу з'яўляецца ганаровым доктарам ангельскага Ліверпульскага ўніверсітэта і нямецкага Тэхналагічнага ўніверсітэта ў Хемніцэ.



Барозу сур'езна захапіўся палітыкай у студэнцкія гады пад час падзей 25 красавіка 1974 года, калі ў Партугаліі быў зрынуты фашысцкі рэжым, Барозу знаходзіўся ў кіраўніцтве Федэрацыі студэнтаў марксістаў-ленінцаў. Затым Барозу далучыўся да мааісцкага Руху за рэарганізацыю партыі пралетарыята (цяпер Камуністычная партыя партугальскіх працаўнікоў) і браў удзел у студэнцкіх страйках і мітынгах.

У 1980 г. Барозу ўступіў у права-цэнтрысцкую Сацыял-дэмакратычную партыю, адну з найбольш уплывовых палітычных сіл у краіне. У 1985 г. Барозу ўпершыню заняў адказны пост ва ўрадзе сацыял-дэмакратаў, стаўшы намеснікам статс-сакратара ў міністэрстве ўнутраных спраў. У 1987 ён атрымаў пасаду статс-сакратара па замежных справах і супрацоўніцтву пры міністэрстве замежных справаў. На гэтым пасту ён прыняў дзейны ўдзел у арганізацыі перамоў варагуючых бакоў у былой партугальскай амбасадзе ў Анголе, а таксама пад час урэгулявання сітуацыі вакол яшчэ адной былой амбасады Партугаліі, Усходняга Тымора. У 1992 г. Барозу атрымаў пост міністра замежных спраў, які займаў да 1995 г., калі сацыял-дэмакраты атрымалі паразу на выбарах.

У той час, як сацыял-дэмакраты знаходзіліся ў апазіцыі, Барозу быў дзейным дэпутатам парламента, займаючы пост старшыні камісіі па вонкавых зносінах. У 1999 ён быў абраны старшынёй Сацыял-дэмакратычнай партыі, стаўшы такім чынам лідарам апазіцыі.

Пад кіраўніцтвам Барозу партыя па выніках парламенцкіх выбараў 2002 г. змагла зноў прыйсці да ўлады. 6 красавіка 2002 Барозу ўзначаліў кааліцыйны ўрад, у які, апроч сацыял-дэмакратаў, увайшлі таксама прадстаўнікі Народнай партыі. Унутраная палітыка кабінета заключалася ў рашэнні пытання зніжэння дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту. Паводле нарматываў ЕС, дэфіцыт не можа перавышаць 3 %, і ўрад Барозу паставіў сабе мэтай дасягнуць гэтага паказчыка. Аднак, Бррозу прапрацаваў на пасту кіраўніка ўрада Партугаліі толькі два гады.

5 ліпеня 2004г. яго кандыдатура была прапанавана на вакантны пост старшыні Еўрапейскай камісіі і неўзабаве ён пакінуў пост прэм'ер-міністра Партугаліі. 23 лістапада 2004 Барозу быў зацверджаны Еўрапейскім парламентам на пасадзе кіраўніка Еўрапейскай камісіі.

16 верасня 2009 кандыдатура Барозу на пост старшыні Еўрапейскай камісіі была паўторна ўхвалена Еўрапейскім парламентам у першую чаргу дзякуючы галасам еўрапейскіх кансерватараў. Галасаванне праходзіла на безальтэрнатыўнай аснове. У падтрымку Барроозу прагаласавалі 382 дэпутата, супраць - 219, устрымаліся - 117.

Жанаты на Маргарыдзе Соуза Ува, у шлюбе з ёй мае трох дзяцей: Луіша, Гільермі і Франсішку. Апроч роднай партугальскай валодае ангельскай і іспанскай, вольна размаўляе на французскай мове. Кавалер Вялікага крыжа ордэна Вітаўтаса Вялікага (Літва, 14 чэрвеня 2007 г.).

# КРЫЗІС НЕ ПАЎТОРЫЦЦА

**Ў свеце яшчэ вельмі высокі ўзровень нявызначанасці, аднак паўтору эканамічнага крызісу 2008 года не адбудзецца.**

Так супакоіў грамадскасць 6 верасня, прэзідэнт Сусветнага банка **Роберт Зэлік**, які знаходзіўся з візітам у Сінгапуры.

"Я не думаю, што Злучаныя Штаты Амерыкі, як і ўвесь астатні цывілізаваны свет, увойдуць у паўторную рэцэсію. Эканоміка Амерыкі будзе ў далейшым павольна расці, аднак захаваецца высокі ўзровень беспрацоўя.

У той жа час і я, і іншыя адмыслоўцы ў сферы эканомікі і фінансаў, у прыватнасці, частка Міжнароднага Валютнага Фонду **Крысцін Лагард**, вылучаем падзеі ў еўразоне, бо яны могуць мець хвалепадобны эфект па ўсім свеце. За гэтым трэба ўважліва сачыць і зрабіць так, каб пры любых варыянтах развіцця падзеяў у Еўропе, сусвет спаў спакойна", - сказаў Р.Зэлік.

КРАІНЫ ЕС

# БАЛГАРЫЯ

**Балгарыя – парламенцкая рэспубліка, унітарная дзяржава з мясцовым самакіраваннем. У Рэспубліцы Балгарыя недапушчальна утварэнне аўтаномных тэрыторый.**

Палітычнае жыццё Рэспублікі Балгарыя засноўваецца на прынцыпах палітычнага плюралізму. Ніводная палітычная партыя ці ідэалогія не можа лічыцца ці аб'яўляцца дзяржаўнай.



Недапушчальна стварэнне палітычных партый на этнічнай, расавай ці рэлігійнай аснове, роўна як і партый, якія ставяць за мэту гвалтоўны захоп дзяржаўнай улады. Канстытуцыя краіны прынята ў 1991 годзе. Вышэйшым органам заканадаўчай улады з'яўляецца однапалатны Народны Сход, які абіраецца раз у чатыры гады ў складзе 240 дэпутатаў. Выбары ў парламент засноўваюцца на прынцыпах усеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права, шляхам таемнага галасавання. Права на ўдзел у выбарах надаецца ўсім балгарскім грамадзянам, якія дасягнулі паўналецця - 18 гадоў, а быць абраным можа любы грамадзянін краіны, які не мае іншага грамадзянства, не маладзейшы 21 гады.

Прэзідэнт рэспублікі з'яўляецца часткай дзяржавы і вярхоўным галоўнакамандуючым узброенымі сіламі. Абіраецца прамым галасаваннем на тэрмін у пяць гадоў.

Рада Міністраў з'яўляецца цэнтральным органам выканаўчай улады. Абіраецца Народным Сходам па прапанове прэм'ер-міністра, якому прэзідэнт даручае скласці кабінет. Рада Міністраў кіруе ўнутранай і вонкавай палітыкай дзяржавы, забяспечвае грамадскі парадак і нацыянальную бяспеку. Рада міністраў ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва дзяржаўнай адміністрацыяй і Ўзброенымі сіламі, выкананнем дзяржаўнага бюджэту. Дзейнасць урада непасрэдна кантралюецца парламентам.

Прэм'ер-міністр кіруе агульнай палітыкай кабінета. Чальцам урада забаронена займацца дзейнасцю, якая несумяшчальная са становішчам народнага прадстаўніка. Дзяржаўныя службоўцы павінны кіравацца толькі законам і быць палітычна нейтральнымі.

Судовая ўлада абараняе правы і законныя інтарэсы грамадзян, юрыдычных асоб і дзяржавы. Судовая ўлада – незалежная. Падчас ажыццяўлення сваіх функцый суддзі, судовыя засядацели, пракуроры і следчыя падпарадкоўваюцца толькі закону.

Тэрыторыя Рэспублікі Балгарыі падзелена на 28 абласцей і 278 муніцыпалітэтаў (абшчын). Найбольш буйныя гарады: Плоўдзіў, Варна, Бургас, Русэ. Муніцыпалітэты - гэта асобныя юрыдычныя ўтварэнні, якія маюць права на ўласны, незалежны ад дзяржавы муніцыпальны бюджэт. Муніцыпальная рада з'яўляецца мясцовым кіруючым органам, які вызначае далейшае развіццё муніцыпалітэта.

Рэгіён – гэта адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, дзякуючы якой Урад краіны напроста ажыццяўляе сваю палітыку. Рэгіён кіруецца рэгіянальным прадстаўніком цэнтральнай улады і рэгіянальнай адміністрацыяй, чыя дзейнасць фінансуецца напроста з бюджэту краіны. Рэгіянальныя прадстаўнікі атрымліваюць сваё прызначэнне толькі па рашэнні Рады Міністраў Балгарыі.

Эканоміка, па Канстытуцыі Балгарыі, павінна засноўвацца на вольнай гаспадарчай ініцыятыве. Права ўласнасці і ўспадкоўванні гарантуецца і абараняецца законам. Уласнасць - прыватная і публічная. Прыватная ўласнасць недатыкальная.

# ФРАНЦУЗЫ ЗА ПАШЫРЭННЕ СТАБФОНДА ЕС

**Французскія парламентарыі першымі з краін еўразоны зацвердзілі пашырэнне стабілізацыйнага фонда ЕС. Дэпутаты Нацыянальнага збору Францыі зацвердзілі законапраект пра пашырэнне Еўрапейскага фонду фінансавай стабільнасці, які зробіць магчымым і падаванне другога пакета фінансавай дапамогі Афінам.**

Нацыянальны парламент Францыі зацвердзіў пашырэнне Еўрапейскага фонду фінансавай стабільнасці (EFSF), які павінен згуляць ключавую ролю ў выратаванні еўра, а таксама зробіць магчымым надання другога пакета дапамогі Грэцыі. Адпаведны закон дэпутаты Нацыянальнага сходу ухвалілі 7 верасня.

Найперш за яго прагаласавалі прадстаўнікі кансерватыўнага блока. У Нацыянальным савеце Францыі не было перакананых супернікаў сцвярджэння законапраекта EFSF. Аднак дэпутаты Сацыялістычнай партыі устрымаліся пры галасаванні – яны лічаць гэты праект недастатковым, патрабуючы ўводзінаў еўрабондаў.

Пакет дапамогі Грэцыі, фундаваны праз EFSF, да 2014 г. павялічыць узровень дзяржаўнай запазычанасці ў самой Францыі на 15 мільярдаў еўра. У канцы тыдня праект пашырэння EFSF будзе вынесены на галасаванне ў французскім Сенаце.

# СЛУЖБА Ў ФІНСКІМ ВОЙСКУ

**Сяргей Паўлаў патрапіў у войска некалькі гадоў назад, дзённік на службе не вёў, напісаў проста па памяці.**

Спачатку хацелася б распавесці не пра само войска, а пра тое, як я туды патрапіў.

Аднойчы мяне затрымалі на памежным кантролі падчас паездкі ў Расію. Памежнік, паглядзеўшы мой пашпарт, спытаў: чаму я не адслужыў у войску? Потым мяне паклікаў да сябе ў кабінет начальнік змены і ўручыў позву, якая абавязвала мяне з'явіцца праз 2 тыдні ў Туусула (месца пад Хельсінкі). З сабой трэба было мець нумар банкаўскага рахунку для атрымання кампенсавання за дарогу і медыцынскую даведку.

У медыцынскім кабінеце пажылы лекар,зірнуўшы на маё пасведчанне асобы, спытаў пра маё здароўе і без усякіх аналізаў, аглядаў, рэнтгенаў і іншых працэдур палічыў мяне прыдатным для выканання вайсковага абавязку.

Затым я прайшоў у залу, дзе засядала адмысловая камісія з трох афіцэраў і сакратаркі. Мяне спыталі, ці служыў я ў Расіі? Я адказаў, што не. Тады мне паведамілі, што вызваленне ад войска атрымліваюць толькі асобы, якія адслужылі ва ўзброеных сілах замежных дзяржаваў не менш за чатыры месяцы. Такім чынам, па законе я падлягаю ваеннай службе ў Фінляндыі.

Потым мяне спыталі, у якіх войсках я б жадаў служыць. Мне сказалі, што ёсць магчымасць пайсці на службу ўжо гэтым летам, і я пагадзіўся. Там жа мне выдалі позву з абавязкам з'явіцца ў вайсковую частку для праходжання службы, бясплатныя квіткі на аўтобус і цягнік да месца прызначэння, кнігу (гід будучага салдата), у якой распавядалася пра службу ў фінскім войску, пра роды войскаў і г.д., а самае галоўнае, якія неабходна ўзяць з сабой рэчы.

**ПЕРШЫ ДЗЕНЬ У ВОЙСКУ**

Напярэдадні ад'езду я сабраў сваю торбу паводле азначанага пераліку: гігіенічнае прыладдзе, мабільны тэлефон і ёмістую торбу, у якую можна скласці грамадзянскую адзежу, каб у найбліжэйшыя выходныя адвезці іх дахаты.

У позве было адзначана, што неабходна прыбыць у вайсковую частку ў прызначаны дзень да 17 гадзін.

Калі я прыбыў на месца, мяне адразу паставілі ў чаргу, якая вяла ў актавую залу гарнізона. Там я назваў дзяжурнаму сваё імя, і мяне накіравалі да групы малодшых сяржантаў, стараслужачых, маёй будучай часткі.

Сабраўшы яшчэ некалькі навабранцаў, адзін з сяржантаў павёў нас у нашу казарму. Па пуці мы зайшлі на рэчавы склад, дзе атрымалі пасцельную і ніжнюю бялізну.

Прыйшоўшы на месца, мы адзначыліся ў дзяжурнага, і нас накіравалі да стала, за якім ізноў жа сядзелі сяржанты. Яны выдалі нам бланкі з персанальнымі дадзенымі. Калі я яго запоўніў, адзін з іх спытаў мяне: "Якія ў цябе вынікі на тэсце Купера?" (тэст па бегу на цягавітасць). Ацэньвальна зірнуўшы на маю спартовую постаць, гучна сказаў: "Першае аддзяленне!". Мне выдалі замок і ключ ад маёй будучай шафкі. Пасля гэтага адзін са стараслужачых праводзіў мяне ў мой пакой. Пасля я даведаўся, што аддзяленні фармуюцца па прынцыпе фізічнай формы, і собіла ж мяне патрапіць у самае прасунутае з іх. Усяго было 3 аддзяленні, прыкладна па 50 чалавек у кожным, якія і складалі роту.



Жаўнерня – чысты, адрамантаваны будынак, у якім было прахалодна ўлетку і цёпала ўзімку. Чысціню ў палатах падтрымлівалі самі салдаты. На кожным паверсе – некалькі туалетаў і душавых, гэтых месцаў было досыць, чэргаў ніколі не было. Сауны знаходзіліся ў іншым памяшканні. Таксама ў жаўнерні быў пакой адпачынку з тэлевізарам і кампутарамі, але знаходзіцца там дазвалялася толькі ў вольны час. На першым паверсе - спартовая зала з настольным тэнісам, штангамі... Вялікая зала з баскетбольнымі пляцоўкамі і велізарнай колькасцю разнастайных трэнажораў размяшчалася ў асобным будынку. Наша казарма на 14 чалавек была вельмі прасторная і светлая, ля кожнага ложка – зэдлічак і шафа, ля вакна – велізарны стол. Два ложкі былі занятыя малодшымі сяржантамі, начальнікамі нашага пакоя. Паколькі я прыбыў раніцай, то апынуўся першым навабранцам, і з 12 вольных месцаў я абраў "лепшае" –ля вакна, заслаў ложак і расклаў рэчы ў сваёй шафе. Праз нейкі час адзін з сяржантаў паклікаў мяне на гутарку да капітана – начальніка нашай роты.

Пасля знаёмства з капітанам і абеду ў сталовай адправіліся на склад за амуніцыяй. Ездзілі туды на грузавой машыне, па некалькі

# СЛУЖБА Ў ФІНСКІМ ВОЙСКУ

чалавек за раз, па меры прыбыцця навабранцаў. На складзе нам выдалі некалькі камплектаў формы, абутак і адзежу (зімовую, летнюю, спартовую), бронекамізэльку, каску, спальны мяшок, і шмат чаго іншага. Набралася велізарная непад'ёмная торба. Такую толькі на грузавіку можна прывезці.

Вярнуўшыся ў жаўнерню, пад кіраўніцтвам аднаго з афіцэраў спраўджвалі змесціва са спісам, каб усё было ў наяўнасці.

Першы тыдзень службы галоўным чынам складаецца з лекцый пра правілы паводзінаў у войску, знаёмствам з гарнізонам, атрымання зброі і інвентара, медагляду. Да медагляду – усе фізічныя практыкаванні ў войску забаронены. Толькі напачатку другога тыдня пачынаюцца практыкаванні з паступовым падвышэннем нагрузкі.

Дапусцім задача: вывучыць сродкі хімабароны і навучыцца хутка карыстацца імі. Разбіваемся на групы па 8-10 чалавек (2 сяржанты і 8 салдат). Першы раз сяржанты паказваюць нам, як правільна і хутка надзець поўны хімабаронны гарнітур, другі раз мы прарабляем гэта паэтапна, трэці раз – ужо самастойна і без падказак. Калі якасць і хуткасць былі здавальняючымі, то паўтораў больш не будзе і можна пераходзіць да наступнай навучальнай задачы. Усім навучальным працэсам кіруе афіцэр, які час ад часу падказвае ці каментуе тое, што адбываецца.

**СТРУКТУРА ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ Ў ФІНЛЯНДЫІ**

Ваенная служба ў Фінляндыі падзяляецца на тры роўных па часе этапу: P, E і J.

Падчас першага перыяда салдаты спасцігаюць базавыя навыкі байцоў – уменне валодаць зброяй, стральба, фізічная падрыхтоўка, спартовае арыентаванне, доўгія марш-кідкі. Шмат часу надаецца страявой падрыхтоўцы.

На другім этапе салдаты набываюць ваенную прафесію. Радысты вучацца абыходзіцца з рацыяй і наладжваць сувязь, кухары – рыхтаваць ежу, артылерысты – страляць з гарматаў, сапёры – абясшкоджваць міны.

Задача трэцяга этапу службы – навучыцца карыстацца набытымі навыкамі, атрыманымі пад час этапу E на практыцы і ваенных манеўрах. Гэта значыць, што вучэнні ідуць адно за адным, і салдаты вялікую частку апошніх двух месяцаў службы праводзяць у лесе. А сканчаецца гэта апошнім ваенным лагерам (Loppusota - канец вайны), падчас якога салдаты дэманструюць усё тое, чаму навучыліся за доўгія месяцы службы.

**ТЭРМІН СЛУЖБЫ**

Тэрмін службы ў фінскім войску складае 6, 9 ці 12 месяцаў. Большасць маладых людзей служаць 6 месяцаў. 9 месяцаў служаць тыя, чые ваенныя прафесіі патрабуюць даўжэйшага навучання. Напрыклад, ваенныя санітары ці ваенная паліцыя. 12 месяцаў служаць тыя, з каго рыхтуюць малодшы камандны склад (малодшыя сяржанты). У іх задачы ўваходзіць навучанне навабранцаў дысцыпліне і прынцыпам армейскай службы. Малодшымі камандзірамі становіцца прыкладна чвэрць усяго кантынгенту – вялікая частка па жаданні, але могуць адправіць і прымусова, пры ўмове, калі не будзе хапаць добраахвотнікаў. Таксама 12 месяцаў служаць кіроўцы, ва ўзнагароду атрымоўваючы правы кіроўцы.

**ЕЖА Ў ВОЙСКУ**

Кормяць у фінскім войску добра – гэта разнастайны і багаты шведскі стол тры разы на дзень без абмежавання – гэтага я лічу цалкам дастаткова для насычэння салдацкіх страўнікаў. Абмежаванні толькі на мяса, садавіну і дэсерт (ёгурты ці марожанае). Меню ўвесь час змяняецца.

На сняданак - каша, кукурузныя шматкі, бутэрброды з каўбасой і сырам, напоі (кава, какава, малако ці чай).

На падабед - катлеты з гарнірам, розныя салаты, чай, малако, квас. На дэсерт марозіва ці садавіна.

На абед - гарохавы суп і бліны з варэннем. Ізноў жа дэсерт.

У дадатак да гэтага, ужо ў вольны час можна пайсці на вячэру. На вячэру хадзілі вельмі рэдка, не вельмі хацелася рушыць крокам у вольны час. Звычайна на вячэру набіралася з нашай роты чалавек 10-15. Ды і я сам быў на вячэры ўсяго пару разоў. На вячэру давалі бутэрброды з вяндлінай ці сырам, садавіну, пакінутыя з абеду, часам, гамбургеры ці марозіва.

Для вегетарыянцаў і алергікаў складаецца асобнае меню.

**ПРЫСЯГА**

Прынясце Ваеннай прысягі - самы ўрачысты дзень у войску.

Да гэтага моманту прызыўнікі ўжо ўмеюць страляць, маршаваць, арыентавацца па карце, карыстацца процігазам. Загадзя складаюцца спісы запрошаных і высылаюцца ім. У наш гарнізон прыехалі больш за 4 тысячы гасцей. Пасля параду бацькі аглядалі жаўнерні, дапаможныя памяшканні, размаўлялі з афіцэрамі. Знаёміліся з графікамі здадзеных залікаў, якія на вялікіх плакатах віселі на сценах. Пасля гэтага ўсіх запрасілі на абед. Гарохавы суп, маленькія скрыначкі з маслам і джэмам, пакуначкі з гарчыцай - усё гэта госці спрабавалі з задавальненнем. Да вечара мы атрымалі адпачынак і раз'ехаліся па хатах.

(працяг у наступным нумары)

# РЭЙТЫНГ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

**У рэйтынгу канкурэнтаздольнасці эканомік свету Расія апусцілася на тры радкі да 66-га месца. Нямеччына займае шостае месца, спіс па-ранейшаму ўзначальвае Швейцарыя, за ёй ідуць Сінгапур і Швецыя.**

Зніжэнне месца Расіі ў спісе звязана з тым, што, нягледзячы на паляпшэнне макраэканамічнай стабільнасці, адбылося пагаршэнне сітуацыі ў іншых сферах. У прыватнасці, гэта датычыцца якасці працы інстытутаў, эфектыўнасці рынка працы, мадэрнізацыі бізнэсу, інавацый.

Недастатковы прагрэс у істытуцыянальнай інфраструктуры выклікае адмысловую заклапочанасць, бо гэта сфера можа з'яўляцца адным з найболей значных стрымальных фактараў канкурэнтаздольнасці эканомікі Расіі.

Па суседству з Расіяй знаходзяцца Латвія (64-е месца), В'етнам (65-е), Перу (67-е), Калумбія (68-е). Украіна сёлета паднялася ў рэйтынгу на 7 радкоў да 82-га месца. За два гады да гэтага яна звалілася на 16 пазіцый. Казахстан застаўся на 72-й пазіцыі. Вышэй усіх з краін былога СССР знаходзіцца Эстонія (33-е месца), за ёй вынікаюць Літва (44-е) і Азербайджан (55-е).

Нямеччына займае ў спісе шостае месца, адзначае агенцтва DAPD. У якасці "праблематычных фактараў для прадпрымальнікаў" аўтары дакладу называюць занадта складаную сістэму падаткаабкладання, неэфектыўную бюракратыю, празмерную зарэгуляванасць рынка працы, недастатковы ўзровень адукацыі працаўнікоў. У той жа час дадатнымі момантамі з'яўляюцца эфектыўная сістэма аховы здароўя, а таксама нізкі ўзровень злачыннасці.

Першае месца ў рэйтынгу па-ранейшаму займае Швейцарыя, за ёй ідуць Сінгапур, Швецыя і Фінляндыя (год назад яны былі адпаведна на 3-м, 2-м і 7-м месцах). ЗША прыкметна пагоршылі пазіцыю: з першага месца тры гады назад яны адкаціліся на пятае. Эксперты тлумачаць гэта гіганцкай дзяржаўнай запазычанасцю і істотным зніжэннем даверу насельніцтва да амерыканскай адміністрацыі. Месцы з 7-га па 9-е займаюць Нідэрланды, Данія і Японія, замыкае дзясятку краін-лідараў Вялікабрытанія, якая паднялася на дзве пазіцыі. Кітай знаходзіцца на 26-м месцы, у канцы спісу апынуліся Бурундзі (140-е), Гаіці (141-е) і Чад (142-е).

Рэйтынг канкурэнтаздольнасці складаецца штогод на аснове адкрытай інфармацыі, а таксама з улікам меркавання некалькіх тысяч экспертаў з больш за 100 краінаў.

# ЕЎРАКАМІСАР АБВІНАВАЦІЎ БЕЛАРУСЬ У ПАРУШЭННІ ПРЫНЦЫПАЎ ААН

**Камісар па правах чалавека Савета Еўропы Томас Хамарберг размясціў у еўрапейскай палітычнай газеце New Europe свой артыкул, прысвечаны арышту беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага.**

Дыпламат робіць выснову, што беларускія ўлады спрабуюць спыніць аказанне "Вясной" дапамогі ахвярам парушэнняў правоў чалавека.



"Для некалькіх праваабарончых арганізацый адкрыццё асабістых рахункаў у Літве і Польшчы было адзіна магчымым спосабам атрымання ахвяраванняў для таго, каб працягваць дапамагаць людзям, якім гэта неабходна, — піша Томас Хамарберг. — Беларускія ўлады аказваюць моцны ціск на праваабаронцаў шляхам прыцягнення іх да крымінальнай адказнасці. Гэтая сітуацыя з'яўляецца прамым парушэннем прынцыпаў, устаноўленых Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і іншых адпаведных міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека".

Дарэчы, Дэкларацыя ААН "Аб праваабаронцах" 1998 году прадугледжвае, што кожны чалавек мае права, у мэтах прасоўвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод "ствараць, далучацца і ўдзельнічаць у дзейнасці няўрадавых арганізацый, асацыяцый або груп". Дэкларацыя таксама абвяшчае, што кожны мае права "мірнымі сродкамі запытваць, атрымліваць і выкарыстоўваць рэсурсы спецыяльна для мэтаў прасоўвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод".

Такім чынам, абвінавачванні ў бок Беларусі, якія агучыў у сваім артыкуле еўракамісар па правах чалавека, маюць пад сабой падставу і з'яўляюцца вельмі сур'езнымі.

Еўракамісар абвінаваціў Беларусь у парушэнні прынцыпаў ААН.

# “ ЕСТЬ У МЕНЯ ОДНО ЖЕЛАНЬЕ”

**8 верасня ў будынку еўрапейскага дому зацікаўленыя віцебчукі сустрэліся з мясцовым паэтам Канстанцінам Севярынцам.**

Сустрэча пачалася з таго, што спадар Канстанцін звярнуў увагу прысутных на падабенства таго становішча, у якім апынуўся ён і расейскі паэт **Арсень Таркоўскі**, калі талент і слава іхніх дзяцей **Паўла Севярынца і Андрэя Таркоўскага** значна пераўзышлі вядомасць бацькоўскую. Але яму вельмі прыемна, што ў яго такі сын, якому хапае мужнасці адстойваць свае чалавечыя і палітычныя перакананні.



З ironіяй гаварыў ён пра тое, што дзесьці пад 60 гадоў нарэшце звярнулі увагу на ягоныя вершы, заўважылі, хаця піша вельмі даўно. Піша па-беларуску, і па-расейску, але ідэю двухмоўя не падзяляе.

Распавёў паэт і пра свой доўгі шлях да беларушчыны, пачаткам якога сталася вучоба на філфаку БДУ ўжо пасля выключэння зараз вядомага беларускага паэта, а тады студэнта **Алеся Разанава** і ягоных аднадумцаў, якія адкрыта выяўлялі свае нацыянальныя пачуцці, за што і пацярпелі. Але ў тыя часы ён і не думаў, што некалі загаворыць па-беларуску. Тады ягоным юначым захапленнем была сербская мова. Як ён зазначыў, у яго адбыўся “кароткі, але вельмі бурны раман з сербскай літаратурай”. Нейкую частку свайго жыцця ён прысвяціў прекладам з сербскай паэзіі, абазнанасць у якой засведчыў, прачытаўшы ў арыгінале сербскі вершык, а затым агучыўшы свой пераклад па-беларуску.

Тры моўныя плыні злучыліся ў душы паэта: беларуская, руская, сербская. Вершы, якія ён зараз піша, выходзяць то па-беларуску, то па-руску, і ад гэтага нікуды не дзецца. Як аказалася, у Расеі ягоныя вершы для дзяцей уключающца ў паэтычныя зборнікі, а ў інтэрнэце можна лёгка адшукаць і ягоную паэзію, і песні на ягоныя вершы.

Нядаўна ў Воршы выйшаў паэтычны зборнік, у які патрапілі і вершы Канстанціна Севярынца. Патрапілі з тае нагоды, што некалі ён працаваў журналістам у мясцовай газеце, якая зараз называецца “ Аршанская газета”. Публіка з прыхільнасцю аднеслася да прачытаных са зборніка твораў.

Добрым словам прыгадаў віцебскі паэт і вядомага земляка **Генадзя Бураўкіна**, якога ён лічыць найлепшым сучасным беларускім лірыкам-песеннікам, здольным разам з Ігарам Лучанком напісаць шлягер, што здабудзе перамогу і на Еўрабачанні. Хочаце рэцэпт перамогі? Калі ласка: сядаюць разам І.Лучанок і Г.Бураўкін, а з імі спявачка Гюнэш – і беларусы першыя!

Даведаліся прысутныя і пра 50 песень напісаных на ягоныя вершы разам з мясцовы кампазітарам **Мікалаем Яцковым**, які на жаль з-за хваробы не патрапіў на гэтую вечарыну. Распавёў Канстанцін Севярынец і пра свой удзел у конкурсе на гімн для Віцебска. Як аказалася, ягоны тэкст не патрапіў нават у шасцёрку лепшых. І толькі з-за таго, што на галаву пераўзыходзіў усе астатнія, а сама асоба паэта вельмі ўжо не даспадобы тутэйшай уладзе. Дарэчы, пасля грамадскага абмеркавання ўсе 6 “лепшых тэкстаў” былі забракаваныя і конкурс працягнулі.

Трэба таксама зазначыць, што гэта не першы ўдзел паэта-песенніка, перакладчыка ў конкурсах. Як вядома, ягоны пераклад вядомай песні **Алеся Рыбака** журы прызнала лепшым пад час конкурсу на “ Радыё Свабода”. А пасля публікацыі аднаго з ягоных вершаў у Амерыцы ў расейскамоўным чалопісе “ Флорида”, ён стаў першым паэтычным лаўрэатам прэміі “ Лепшыя радкі Фларыды”.

Нягледзячы на немалыя паэтычныя здабыткі К.Севярынец не лічыць сябе паэтам. Па ягоным меркаванні паэт – гэта нешта больш глыбокае, больш сур’ёзнае. Аднак жа назіраючы за рэакцыяй залі, можна сцвярджаць, што прысутныя не пагадзіліся з гэткім меркаваннем усё ж такі паэта і перакладчыка К.Севярынца.

Выступ пакінуў добрыя ўражанні, прысутныя ацанілі самаіронію, гумар, цікавыя жыццёвыя гісторыі, трапныя метафары, эмацыйную насычанасць, добрыя пераклады, чалавечую сціпласць паэта.

А чатырохрадкоўе, прачытанае напрыканцы вечарыны сталася добрым дадаткам да разумення творчае і чалавечае асобы Канстанціна Паўлавіча:

Есть у меня одно желанье:
Когда растаю, словно дым,
хоть чьим-то стать воспоминаньем
И, по возможности, незлым…

**»РУХ у Еўропу»** - грамадска-палітычная газэта. Выдавец - Віцебская абласная арганізацыя ПАГА «Рух за Свабоду». Выдаецца нерэгулярна. Наклад - 299 асобнікаў. Рэдактар - Сяргей Салодкін. Вёрстка - Сяргей Солідны. Надрукавана на прыватным абсталяванні на свае сродкі і з дапамогаю адзінадумцаў.